Источник: **«Звязда»** - **2012-04-07**

## Ад Камітэта па Дзяржаўных прэміях Рэспублікі Беларусь

**Падкамітэт па Дзяржаўных прэміях Рэспублікі Беларусь у галіне навукі і тэхнікі паведамляе, што да ўдзелу ў конкурсе на атрыманне Дзяржаўных прэмій Рэспублікі Беларусь у галіне навукі і тэхнікі 2012 года дапушчаны наступныя работы:**

Арцем'еў Міхаіл Валянцінавіч, Лесніковіч Анатоль Іванавіч, Івашкевіч Алег Анатольевіч "Цыкл навуковых прац "Новыя неарганічныя злучэнні і матэрыялы на аснове мікра- і нанапамерных часціц: атрыманне, уласцівасці, прымяненне". Вылучыў Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт. Прадстаўлены Міністэрствам адукацыі Рэспублікі Беларусь.

*Танін Леанід Віктаравіч, Маісеенка Пётр Васільевіч, Макарэвіч Мікалай Яўгенавіч* "Распрацоўка і шырокамаштабнае ўкараненне нацыянальных сродкаў абароны дакументаў, каштоўных папер і асабліва каштоўных аб'ектаў на аснове галаграфічных метадаў". Вылучыла закрытае акцыянернае таварыства "Галаграфічная індустрыя". Прадстаўлена Нацыянальнай акадэміяй навук Беларусі.

*Соцкі Мікалай Барысавіч* "Распрацоўка, асваенне вытворчасці і прасоўванне на замежныя рынкі фрыкцыйных трэнажораў з многімі ступенямі свабоды". Вылучыла ўстанова адукацыі "Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт фізічнай культуры". Прадстаўлена Міністэрствам спорту і турызму Рэспублікі Беларусь.

*Вільчук Канстанцін Усцінавіч, Гнядзько Таццяна Васільеўна, Мастоўнікаў Васіль Андрэевіч*"Інавацыйныя медыцынскія тэхналогіі неінвазіўнай дыягностыкі і лячэння неанатальнай жаўтухі ў дзяцей". Вылучана дзяржаўнай установай "Рэспубліканскі навукова-практычны цэнтр "Маці і дзіця". Прадстаўлена Міністэрствам аховы здароўя Рэспублікі Беларусь.

*Багатыроў Юрый Уладзіміравіч, Турцэвіч Аркадзь Сцяпанавіч, Шведаў Сяргей Васільевіч*"Распрацоўка і арганізацыя прамысловай вытворчасці канкурэнтаздольных высоканадзейных мікраэлектронных вырабаў двайнога і спецыяльнага прызначэння". Вылучылі дзяржаўнае аб'яднанне "НПЦ НАН Беларусі па матэрыялазнаўстве" і адкрытае акцыянернае таварыства "Інтэграл". Прадстаўлена Міністэрствам прамысловасці Рэспублікі Беларусь.

*Глухманчук Уладзімір Уладзіміравіч, Зайцаў Валерый Аляксандравіч, Чыжык Сяргей Антонавіч*"Распрацоўка і асваенне выпуску высокадакладнага зборачнага і зондавага абсталявання, яго інтэграцыя ў вытворчасць вырабаў мікраэлектронікі спецыяльнага і двайнога прызначэння". Вылучана дзяржаўным навукова-вытворчым аб'яднаннем дакладнага машынабудавання "Планар". Прадстаўлена Міністэрствам прамысловасці Рэспублікі Беларусь.

*Сцяпук Леанід Якаўлевіч, Казачонак Сяргей Аляксеевіч, Самасюк Уладзімір Георгіевіч*"Стварэнне і асваенне імпартазамяшчальных прыярытэтных комплексаў сістэмы машын для механізацыі тэхналагічных працэсаў у земляробстве Рэспублікі Беларусь". Вылучана рэспубліканскім унітарным прадпрыемствам "НПЦ НАН Беларусі па механізацыі сельскай гаспадаркі". Прадстаўлена Нацыянальнай акадэміяй навук Беларусі.

*Галавач Андрэй Альбертавіч, Нікалаеў Юрый Іванавіч, Гарко Яўген Аляксеевіч* "Распрацоўка і асваенне вытворчасці спецыяльных колавых шасі і цягачоў чацвёртага пакалення ваенна-

тэхнічнага і двайнога прызначэння". Вылучыла адкрытае акцыянернае таварыства "Мінскі завод колавых цягачоў". Прадстаўлена Дзяржаўным ваенна-прамысловым камітэтам Рэспублікі Беларусь.

*Піліпенка Уладзімір Мітрафанавіч, Данілеўскі Леанід Мікалаевіч, Пацяршчук Уладзімір Анатольевіч* "Інавацыйныя тэхналогіі, інжынерныя і праектныя рашэнні энергаэфектыўных жылых дамоў масавага будаўніцтва". Вылучыла рэспубліканскае ўнітарнае прадпрыемства "Інстытут жылля — НДПТІБ імя Атаева С.С.". Прадстаўлена Міністэрствам архітэктуры і будаўніцтва Рэспублікі Беларусь.

Падкамітэт па Дзяржаўных прэміях Рэспублікі Беларусь у галіне навукі і тэхнікі звяртаецца да спецыялістаў, кіраўнікоў арганізацый, вышэйшых навучальных устаноў, прадпрыемстваў, органаў дзяржаўнага кіравання, грамадскіх аб'яднанняў з просьбай прыняць удзел у абмеркаванні ўказаных работ і аўтарскіх калектываў.

Водгукі спецыялістаў, матэрыялы грамадскага абмеркавання, прапановы і заўвагі па работах і аўтарскіх калектывах прымаюцца да 15 верасня 2012 года па адрасе: 220072, г. Мінск, пр-т Незалежнасці, 66. Падкамітэт па Дзяржаўных прэміях Рэспублікі Беларусь у галіне навукі і тэхнікі.

Тэл.(017) 284-11-63; тэл. / факс (017) 284-24-56.

Падкамітэт па Дзяржаўных прэміях Рэспублікі Беларусь у галіне літаратуры, мастацтва і архітэктуры паведамляе, што да ўдзелу ў конкурсе на атрыманне Дзяржаўных прэмій Рэспублікі Беларусь у галіне літаратуры, мастацтва і архітэктуры 2012 года дапушчаны наступныя работы:

*Мацкевіч Вольга Васільеўна, Манаеў Віктар Сяргеевіч, Зубрыч Андрэй Дзмітрыевіч.* Спектакль "Пінская шляхта" В.Дуніна-Марцінкевіча. Вылучаны дзяржаўнай установай "Нацыянальны акадэмічны драматычны тэатр імя Янкі Купалы". Прадстаўлены Міністэрствам культуры Рэспублікі Беларусь.

*Шабалін Анатоль Андрэевіч, Рымашэўская Раіса Генадзеўна, Іванова Людміла Уладзіміраўна.*Рэканструкцыя і рэстаўрацыя Нацыянальнага акадэмічнага Вялікага тэатра оперы і балета Рэспублікі Беларусь. Вылучыла рэспубліканскае ўнітарнае прадпрыемства "Інстытут Белдзяржпраект". Прадстаўлена Міністэрствам культуры Рэспублікі Беларусь.

*Чарняўскі Мікалай Мікалаевіч.* Кніга для дзяцей "Сонечны кошык" (2009). Вылучана: установа "Рэдакцыя часопіса "Вясёлка". Прадстаўлена Міністэрствам культуры Рэспублікі Беларусь.

*Дарафеева Ірына Аркадзеўна.* За стварэнне і выкананне аўтарскіх канцэртных праграм у рамках сацыяльна-гуманітарнага тура "Пад мірным небам" у 2001-2009 гадах у падтрымку Дзяржаўнай праграмы адраджэння і развіцця вёскі. Вылучана ўстановай "Беларуская дзяржаўная ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга філармонія". Прадстаўлена Міністэрствам культуры Рэспублікі Беларусь.

*Плігаўка Уладзіслаў Мікалаевіч.* За значныя дасягненні выканальніцкага майстэрства пры падрыхтоўцы і выкананні канцэртных праграм у 2002-2009 гадах. Вылучана ўстановай "Беларуская дзяржаўная ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга філармонія". Прадстаўлена Міністэрствам культуры Рэспублікі Беларусь.

*Слабодчыкаў Уладзімір Іванавіч, Марозаў Ігар Вячаслававіч.* Цыкл манументальных работ пад назвай "І памятае свет уратаваны" (2005-2009). Вылучаны ўстановай адукацыі "Беларуская дзяржаўная акадэмія мастацтваў". Прадстаўлены Міністэрствам культуры Рэспублікі Беларусь.

*Бутэвіч Анатоль Іванавіч.* За серыю кніг "Сем цудаў Беларусі". Вылучыла грамадскае аб'яднанне "Беларускі фонд культуры". Прадстаўлены Міністэрствам культуры Рэспублікі Беларусь.

Падкамітэт па Дзяржаўных прэміях Рэспублікі Беларусь у галіне літаратуры, мастацтва і архітэктуры звяртаецца да кіраўнікоў арганізацый, устаноў, вышэйшых навучальных устаноў, прадпрыемстваў, органаў дзяржаўнага кіравання, грамадскіх аб'яднанняў з просьбай прыняць удзел у абмеркаванні пералічаных работ і аўтарскіх калектываў.

Водгукі, матэрыялы грамадскага абмеркавання, прапановы і заўвагі па работах і аўтарах просьба накіроўваць у Падкамітэт па Дзяржаўных прэміях Рэспублікі Беларусь у галіне літаратуры, мастацтва і архітэктуры да 15 верасня 2012 года на адрас: 220072, г. Мінск, вул. Сурганава, 1, корп.  2, каб. 412.

Тэл./факс (017) 284-23-81.

*УНП 101078490.*